## *Старонка 1*

1) раздрукуйце **Старонку 1**
2) павярніце ў друкарцы паперу
3) раздрукуйце **Старонку 2**
4) выражце па пункціры

### КАЛІ ВАС ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ

- Заставайцеся спакойнымі і стрыманымі: агрэсія ці страх могуць справакаваць на ўжыванне гвалту супраць вас
- Удакладніце, якое правапарушэнне вам ставяць у віну, і патлумачце, што займаецеся журналісцкай дзейнасцю
- Высветліце і запомніце (а лепш запішыце), хто вас затрымлівае
- Патрабуйце, **каб пра ваша месцазнаходжанне паведамілі** вашым родным ці адвакату; калі не маеце пагаднення з адвакатам – няхай вашыя сваякі заключаць з ім пагадненне
- Памятайце, што ў выпадку затрымання на тэрмін, большы за тры гадзіны, яно павінна афармляцца пратаколам. Тэрмін адміністратыўнага затрымання адлічваецца ад **моманту фактычнага затрымання**
- Падчас складання пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне вас мусяць азнаёміць з вашымі правамі
- Уважліва чытайце пратакол пра адміністратыўнае правапарушэнне ці затрыманне; не адмаўляйцеся ад яго падпісання, а ўносьце ў пратакол усе свае заўвагі наконт таго, што здарылася, дзеянняў міліцыі, парушэнняў вашых правоў
- З моманту, калі вам абвесцілі пра ваша затрыманне ці склалі пратакол, **патрабуйце адваката** і адмаўляйцеся без яго прысутнасці ад удзелу ў любых працэсуальных дзеяннях
- Пры правядзенні асабістага вобшуку памятайце, што ён павінен адбывацца ў прысутнасці панятых, са складаннем пратаколу ці адпаведным запісам у пратаколе аб адміністратыўным правапарушэнні ці затрыманні. Пры выманні рэчаў таксама патрабуйце складання пратаколу альбо адпаведнага запісу ў пратаколе пра адміністратыўнае правапарушэнне ці затрыманне; сачыце, каб у пратаколе былі **пералічаныя ўсе забраныя рэчы**
- Спробы паставіць вас на фота- ці відэаўлік сведчаць пра тое, што адміністратыўны працэс супраць вас ужо распачалі, і вы маеце права патрабаваць адваката і адмаўляцца да яго прыбыцця ад якіх-кольвек дзеянняў
- Тое самае тычыцца дактыласкапіі; памятайце, што затрыманага могуць прыцягнуць да абавязковай дактыласкапіі толькі ў выпадку, калі за здзейсненае ім правапарушэнне **прадугледжваецца адказнасць у выглядзе адміністратыўнага арышту**
- Памятайце, што вас мусяць азнаёміць з усімі матэрыяламі справы (пратаколамі адміністратыўнага затрымання, пратаколам апытання, іншымі пісьмовымі матэрыяламі справы) і выдаць на рукі копію пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне.

---

Тэлефоны:
(017) 226-70-98
(029) 126-70-98

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

*Старонка 2*

**ВАЖНЫЯ НОРМЫ КАНСТЫТУЦЫІ І ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:**

**Арт.27 Канстытуцыі:** “Ніхто не павінен быць змушаны да дачы паказанняў і тлумачэнняў супраць самога сябе, членаў сваёй сям'і, блізкіх сваякоў. Доказы, атрыманыя з парушэннем закона, не маюць юрыдычнай сілы.”

**Арт.62 Канстытуцыі:** “Кожны мае права на юрыдычную дапамогу для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод, у тым ліку права карыстацца ў любы момант дапамогай адвакатаў і іншых сваіх прадстаўнікоў у судзе, іншых дзяржаўных органах, органах мясцовага кіравання, на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях, грамадскіх аб'яднаннях і ў дачыненнях са службовымі асобамі і грамадзянамі... Супрацьдзеянне аказанню прававой дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь забараняецца”.

**Арт.34 Закона “Аб сродках масавай інфармацыі”**

п.2. У сувязі з ажыццяўленнем прафесійных абавязкаў журналіст сродку масавай інфармацыі мае права:

...2.2. прысутнічаць ... на масавых мерапрыемствах, у месцах іншых грамадска важных падзей і перадаваць адтуль інфармацыю.

**Арт.4.1. Працэсуальна-выканаўчага кодэксу аб адміністратыўных правапарушэннях**

Фізічная асоба, у дачыненні да якой вядзецца адміністратыўны працэс, мае права:

- ведаць, здзяйсненне якога адміністратыўнага правапарушэння ёй ставіцца ў віну;
- даваць тлумачэнні ці адмовіцца даваць тлумачэнні;
- прадстаўляць доказы;
- заяўляць адводы і хадайніцтвы;
- мець абаронцу (адваката) ад пачатку адміністратыўнага працэсу, а ў выпадку адміністратыўнага затрымання - ад моманту абвяшчэння ёй (асобе-заўв. БАЖ) пра адміністратыўнае затрыманне;
- бесперашкодна размаўляць са сваім абаронцам (адвакатам) сам-насам і канфідэцыйна, спыніць паўнамоцтвы свайго абаронцы, адмовіцца ад абаронцы, бараніць сябе самастойна;
- карыстацца роднай мовай ці мовай, якой яна (асоба-заўв. БАЖ) валодае, альбо паслугамі перакладчыка;
- пярэчыць супраць дзеянняў суддзі, асобы, якая вядзе адміністратыўны працэс, і патрабаваць унясення сваіх пярэчанняў у пратакол пра адміністратыўнае правапарушэнне ці ў пратакол працэсуальнага дзеяння;
- знаёміцца з пратаколам пра адміністратыўнае правапарушэнне, а таксама з матэрыяламі справы пра адміністратыўнае правапарушэнне пасля заканчэння падтрыхтоўкі яе да разгляду;
- удзельнічаць у разглядзе справы пра адміністратыўнае правапарушэнне;
- атрымліваць ад суда ці органа, які вядзе адміністратыўны працэс, копію пастановы пра накладанне адміністратыўнага спагнання;
- падаваць скаргі на дзеянні суддзі, службовай асобы, якая вядзе адміністратыўны працэс, у тым ліку абскарджваць пастанову пра адміністратыўнае правапарушэнне.